*Трыгорлава Л. Б.* DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-127-132

УДК 2(476.5-21)"1918-1939"

# КАНФЕСІЙНАЯ ПАЛІТЫКА ЎЛАД НА ПОЛАЧЧЫНЕ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

*Трыгорлава Людміла Браніславаўна,*
*вядучы навуковы супрацоўнік Краязнаўчага музея — філіяла НПГКМЗ*

*У артыкуле даецца кароткая характарыстыка ўзаемаадносін улады і рэлігійных абшчын на Полаччыне ў міжваенны перыяд, адзначаюцца асноўныя формы антырэлігійнай палітыкі і рэпрэсій супраць святароў і веруючых.*

***Ключавыя словы**: канфесіі, канфіскацыя, раскрыццё мошчаў, рэпрэсіі.*

Узаемаадносіны органаў улады і царквы адыгрываюць значную ролю ў грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь. Сёння, у кантэксце паглыблення супрацоўніцтва дзяржавы і рэлігійных арганізацый, не губляе сваёй актуальнасці пытанне аб іх стасунках на розных этапах існавання нашай дзяржаўнасці, у тым ліку і ў перыяд станаўлення, а таксама ўмацавання савецкай улады.

З прыходам да ўлады ў кастрычніку 1917 г. бальшавікоў карэнным чынам змяняецца становішча ўсіх існуючых у Расіі канфесій. Царква была сур'ёзным канкурэнтам савецкай улады ў барацьбе за свядомасць людзей. У студзені 1918 г. абвяшчаюцца дэкрэты «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных грамадствах» і «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы», якія вызначалі пазіцыю новых улад у адносінах да царквы. Гэта і нацыяналізацыя царкоўных і манастырскіх земляў, і спыненне фінансавання на ўтрыманне духавенства, і ліквідацыя дзяржаўных устаноў, якія займаліся справамі рэлігіі. Аднак пэўнай забароны дзейнасці рэлігійных арганізацый яшчэ не існавала. Больш таго, пасля вызвалення тэрыторыі Полаччыны ад германскай акупацыі Віцебскі губвыканкам 14 снежня 1918 г. прымае рашэнне аб перадачы малельных дамоў веруючым і вяртанні ім раней канфіскаваных каштоўнасцей [21, с. 41].

У Полацкім павеце існавалі абшчыны рознай канфесійнай прыналежнасці: яўрэйскія, праваслаўныя, рымска-каталіцкія, пратэстанцкія і стараверскія. У Полацку ў пачатку 1920-х гг. самай шматлікай была яўрэйская абшчына. Другое месца па колькасці веруючых у Полацку займалі праваслаўныя абшчыны, а ў валасцях павета яны дамінавалі. Некаторыя гарадскія прыходы аб'ядноўвалі тысячы веруючых: Іаана-Багаслоўская царква, Сафійскі сабор, Мікалаеўскі сабор.

Кожная абшчына выбірала сабе кіраўніка і рэлігійны савет, які распрацоўваў Статут. Асабістыя звесткі аб кіраўніках рэлігійных арганізацый, занатаваныя на спецыяльных бланках, перадаваліся ў органы НКУС. У дакументах указваліся прозвішча, імя, імя па бацьку, займаемая пасада, узрост, месца жыхарства, сацыяльнае і маёмаснае становішча, партыйнасць, а таксама ўтрымлівалася пытанне аб занятках у 1914 г. Рэлігійныя абшчыны жылі па Статутах, якія распрацоўваліся ў адпаведнасці з новымі нарматыўна-прававымі актамі савецкай дзяржавы. У Статутах вызначалася выбарная сістэма кіравання, сістэма грашовага ўтрымання і ўмовы ліквідацыі абшчын, прычынамі якой маглі стаць патрабанні НКУС, невялікая колькасць веруючых і адсутнасць сродкаў для вядзення царкоўнай гаспадаркі. На працягу месяца абшчыны былі абавязаны прайсці рэгістрацыю і заключыць з уладамі дагавор на будынак і маёмасць. У адпаведнасці са зместам гэтага дакумента яны бралі на сябе матэрыяльнае ўтрыманне храмаў, у тым ліку зямельную рэнту, выплату падаткаў і дзяржаўнае страхаванне [4]. Пры заключэнні дагавору з абшчыны ўтрымліваўся гербавы збор (ад 150 да 500 руб.).

Каб правесці сход абшчыны, яе прадстаўнік звяртаўся да ўлад з адпаведнай заявай, за падачу якой уносілася плата — 1 руб. Калі пытанне вырашалася станоўча, то кіраўнік абшчыны атрымліваў спецыяльную даведку. На сходзе абавязкова запаўнялі пратакол.

Але ў студзені 1922 г. адносіны да царквы мяняюцца, калі прымаецца пастанова «Аб ліквідацыі царкоўнай маёмасці». А ў наступным месяцы з'яўляецца дэкрэт аб канфіскацыі царкоўнай маёмасці і перадачы яе ў органы Наркамфіна. Адной з прычын правядзення канфіскацыі стала знясіленне фінансавай сістэмы савецкай дзяржавы, а нагодай — голад у Паволжы. У адпаведнасці з сакрэтным цыркулярам № 75 ад 4 сакавіка 1922 г. мясцовыя ўлады павінны былі прадаставіць НКУС копіі вопісаў маёмасці цэркваў і ведамасць аб рэгістрацыі рэлігійных абшчын у павятовым выканкаме. Для ведамасці існавала асобная форма, у якой пазначалася дакладная назва царквы і культа, яго месцазнаходжанне, час заключэння дагавора з уладамі, час прадастаўлення вопісаў у НКУС і г.д.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-127-132

Для вырашэння рэлігійнага пытання была створана Віцебская губернская камісія, а на месцах — падкамісіі, у тым ліку і Полацкая. Менавіта яна павінна была азнаёміцца са старымі епархіяльнымі вопісамі маёмасці царквы. Члены падкамісіі атрымлівалі адпаведныя інструкцыі і спецыяльныя даведкі, якія былі сапраўднымі на працягу 10 дзён. Працавалі падкамісіі ў прысутнасці святароў. Аднак калі Полацкая павятовая падкамісія прыступіла да працы, стала вядома, што вопісы маёмасці захаваліся не ўсюды, ды і святары неахвотна ішлі на супрацоўніцтва з падкамісіяй. Часта яны спасылаліся на адсутнасць такога распараджэння з боку вярхоўнай царкоўнай улады, як зрабіў настаяцель рымска-каталіцкага касцёла Леанард Бараноўскі.

Аперацыя па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей атрымала назву «Баявік» і праводзілася пад кантролем ДПУ [18, с. 60]. Пры канфіскацыі каштоўнасцей складаліся вопісы ў трох экзэмплярах. У іх уносіліся нумары прадметаў па парадку, найменне рэчаў, іх вага і памер, якасць матэрыялаў (золата, серабро і інш.) і іншыя асаблівасці. Таксама рабілася пазнака аб неабходнасці рэчы для богаслужэння (акрамя сінагог). У цэрквах і касцёлах былі канфіскаваны напрастольныя крыжы, кадзілы, лампады, аздабленні Евангелляў, рызы ад абразоў. Мастацкая якасць рэчаў падкамісію не цікавіла. Ролю адыгрываў толькі матэрыял, з якога яны зроблены. І ўсё ж аднойчы падкамісія пазначыла мастацкую вартасць канфіскаванага прадмета — меднай чашы 1733 г., вагой крыху больш за 500 *г* з Экіманскай царквы Банонскай воласці [5]. 10 мая 1922 г. у праваслаўных цэрквах і касцёле горада было канфіскавана 87 прадметаў (у асноўным з серабра), агульная вага якіх склала каля 170 *кг* [2, с. 89]. Найбольшая колькасць каштоўнасцей была канфіскавана ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры (у тым ліку сярэбраная рака з-пад мошчаў Еўфрасінні Полацкай). Полацкай падкамісіяй адзначалася, што канфіскацыя царкоўных каштоўнасцей у горадзе прайшла без вострых канфліктаў. Супраціўленне аказаў толькі Міхаіл Дубоўскі, святар Іаана-Багаслоўскай царквы. У Лютэранскай кірсе і Стараверскай царкве Полацка каштоўнасці адсутнічалі, не былі знойдзены яны і ў гарадскіх сінагогах, аб чым складзены адпаведныя акты [6].

У валасцях Полацкага павета кампанія па канфіскацыі праходзіла з 10 па 16 мая 1922 г. З 25 вясковых праваслаўных цэркваў і 3 касцёлаў былі канфіскаваны 92 прадметы з серабра, вага якіх склала каля 20 *кг*. У выпадках, калі святары або веруючыя хадайнічалі аб замене адбіраемых царкоўных каштоўнасцей на сярэбраныя манеты, падкамісія ішла насустрач да вырашэння пытання губкамісіяй. У Артэйкавіцкай царкве на сярэбраныя манеты былі заменены культавыя прадметы вагой больш за 400 *г*, якія святару трэба было даставіць у фінаддзел да 19 мая 1922 г. [7]. Аднак губкамісія не заўсёды станоўча вырашала такія пытанні. Веруючым Лютаўскай царквы Артэйкавіцкай воласці ў гэтым было адмоўлена [8]. Пры канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей мелі месца выступленні веруючых у іх абарону і перавышэнне паўнамоцтваў членамі павятовай падкамісіі. Да судовай адказнасці за гэта быў прыцягнуты селянін в. Тродавічы Мікалаеўскай воласці І. С. Іваноў [9]. У асобных валасцях не аказалася дзеючых цэркваў або каштоўнасцей для канфіскацыі: Арэхаўскі, Андрэеўскі і Юравіцкі валасныя выканкамы прадаставілі падкамісіі адпаведныя даведкі.

Для прыёмкі каштоўнасцей у Полацкім павятовым фінаддзеле была створана спецыяльная камісія. У яе склад уваходзілі: загадчык аддзела т. Баркан, загадчык каштарысна-касавага аддзела т. Арэтаў, кантралёр т. Багоўскі, эксперт т. Левіт, упаўнаважаны па канфіскацыі павятовай камісіі т. Якаўлеў. Прысутнічаў пры гэтым і ўпаўнаважаны Вітгубкамісіі т. Савін [10]. Аднак толькі адна частка каштоўнасцей пайшла на закупку харчавання для галадаючых Паволжа. Другая частка пайшла на падрыхтоўку і правядзенне самой кампаніі, трэцяя — на ўтрыманне партыйнага і дзяржаўнага апаратаў.

Улады актыўна спрабавалі пазбавіць веруючых месцаў пакланення асобам, кананізаваным царквой. Было праведена раскрыццё мошчаў праваслаўнай святой Еўфрасінні Полацкай і католіка Андрэя Баболі. Мошчы Еўфрасінні Полацкай захоўваліся ў Спаса-Праабражэнскай царкве Полацка з 1910 г. Пасля іх раскрыцця 13 мая 1922 г. мошчы былі адпраўлены ў Віцебскі губернскі гісторыка-археалагічны музей і знаходзіліся там да 1943 г. У Полацку з 1808 г. захоўваліся мошчы Андрэя Баболі, якога за місіянерскую дзейнасць у XVII ст. называлі «апосталам Піншчыны». 23 чэрвеня 1922 г. яго мошчы былі раскрытыя [19, с. 195]. Акрамя прадстаўнікоў улады, пры гэтым абавязкова павінны былі прысутнічаць святары. Аднак ксёндз касцёла Маці Божай Іосіф Дзям'ян і яго памочнік Іосіф Лук'янін адмовіліся ад гэтага і былі арыштаваны. Пазней І. Дзям'ян па хаданіцтву веруючых быў вызвалены, але яшчэ тройчы яго будуць арыштоўваць і ў 1937 г. растраляюць. Пасля раскрыцця мошчы Андрэя Баболі былі адпраўлены ў Маскву і выстаўлены ў музеі медыцыны як узор «муміі». Пазней іх перадалі Ватыкану. З 1938 г. мошчы Андрэя Баболі захоўваюцца ў адным з касцёлаў Варшавы.

У канцы 1922 — пачатку 1923 г. у праваслаўнай царквы ўзніклі ўнутраныя праблемы, якія былі выкліканы адносінамі царкоўных іерархаў да савецкай улады. Пачалося супрацьстаянне «ціханаўцаў» і «абнаўленцаў».

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-127-132

Патрыярх Ціхан і шэраг епіскапаў не падтрымалі ўладу бальшавікоў, за што падвергліся рэпрэсіям. «Абнаўленцы» адмовіліся ад некаторых дагматаў і стварылі свой орган кіравання. Адной з першых «абнаўленчых» полацкіх цэркваў стаў Мікалаеўскі сабор. Астатнія праваслаўныя абшчыны Полацка негатыўна аднесліся да з'яўлення ўнутрыцаркоўнай барацьбы [2, с. 137]. 14 студзеня 1923 г. у Полацку прайшоў агульны сход веруючых у царкве Адзінаверчага прыхода. На ім прысутнічалі прадстаўнікі не толькі гарадскіх, але і вясковых цэркваў. У пастанове сходу адмаўлялася ўлада «абнаўленцаў» і ствараўся Полацкі Царкоўны Савет у складзе 30 чалавек. Старшынёй савета стаў А. Лебедзеў. У гэтых умовах рэлігійныя абшчыны Полацкага павета павінны былі прайсці перарэгістрацыю. На 1 сакавіка 1923 г. зарэгістраваліся толькі 18 храмаў павета, у тым ліку 7 гарадскіх. Астатнія не спяшаліся гэта рабіць, і ўлады вымушаны былі працягнуць рэгістрацыю да лістапада 1923 г. Да гэтага часу былі зарэгістраваны гарадскія касцёл, кірха і 17 сінагог.

Летам 1924 г. была створана Полацкая акруга, тэрыторыя якой была значна большай, чым тэрыторыя павета. Адпаведна вырасла не толькі колькасць насельніцтва, але і рэлігійных абшчын. Да восені 1924 г. павялічылася іх грашовая запазычанасць перад дзяржавай па зямельнай рэнце. Для вырашэння гэтай праблемы ў сярэдзіне кастрычніка склікана нарада Полацкага акркамунаддзела, фінаддзела, дзяржстраха з запрашэннем прадстаўнікоў рэлігійных абшчын, якія павінны былі патлумачыць прычыны запазычанасці і пазначыць час яе ліквідацыі. Выступаючы, прадстаўнік Мікалаеўскага сабора адзначаў, што могілкавая царква пры саборы даходу не мае, а запазычанасць перад дзяржавай складае 35 руб. Прагучала просьба да органаў улады аб зніжэнні сумы выплат на 10 руб. або ўвядзенні растэрміноўкі плацяжу рэнты на год. Прадстаўнік пратэстанцкай царквы адзначыў, што не ведаў аб запазычанасці, а яўрэяў — аб адсутнасці службаў увогуле. Але гэтыя тлумачэнні да ўвагі прынятыя не былі. Вынікам нарады стала рашэнне аб увядзенні веруючым платы за адведзенае на могілках месца для пахавання. Доказам такой платы станавілася квітанцыя. Таксама на нарадзе прадстаўнікамі фінаддзела быў агучаны зварот да Полацкага акружвыканкама аб часовым закрыцці рымска-каталіцкага касцёла (сума запазычанасці 544 руб. 50 кап.) і Лютэранскай кірхі (сума запазычанасці 105 руб.), хаця запазычанасць мелі яшчэ 27 цэркваў акругі. У тым ліку Іаана-Багаслоўская — 350 руб., Спаса-Праабражэнская — 978 руб. 25 кап., Пакроўская — 90 руб., Мікалаеўскі сабор — 2 450 руб. і яго могілкавая царква — 35 руб., Стараверская — 272 руб. 13 кап. [21].

У пачатку 1925 г. узмацняецца кантроль НКУС не толькі за касцёламі, якіх у акрузе налічвалася 22, а і за праваслаўнымі цэрквамі. Настаяцелі праваслаўных Пакроўскага і Мікалаеўскага храмаў для правядзення хрэснага ходу да Заходняй Дзвіны падчас святкавання Хрышчэння ў студзені 1925 г. павінны былі атрымаць спецыяльны дазвол [13]. Для правядзення хрэснага ходу ў маі гэтага ж года ў гонар А. Баболі такі дазвол быў выдадзены і рымска-каталіцкаму касцёлу. Далі дазвол акружныя ўлады і царкоўным саветам Богаяўленскай і Свята-Духаўскай цэрквам для запрашэння на богаслужэнне віцебскага епіскапа. У сакавіку 1925 г. шэраг абшчын не змаглі ўнесці страхавую плату. Сярод іх рымска-каталіцкі касцёл, Лютэранская кірха і малітоўны дом на лютэранскіх могілках, Спаскі манастыр і некалькі сінагог [11]. Гэта паспрыяла актывізацыі работы акружной улады па ліквідацыі рэлігійных абшчын у раёнах і сельсаветах Полацкай акругі. У дачыненні Арэхаўскага яўрэйскага малітоўнага дома даваліся дакладныя ўказанні на закрыццё, бо ў абшчыне былі 3 непаўналетнія, і калі іх выключыць, застаецца толькі 49 чалавек (для рэгістрацыі патрэбны 50). Паступова будынкі, якія належалі абшчынам, перадаюцца іншым арганізацыям. Сінагога ў Кублічах адышла 13-му пагранатраду. У 1924 г. закрываецца Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, а ў чэрвені 1925 г. будынкі, якія належалі яму, перададзены ваеннаму ведамству. У гэты ж час райвыканкамы Полацкай акругі, у тым ліку і Ветрынскі, праводзяць улік земляў, якія знаходзіліся ў карыстанні рэлігійных абшчын, канфіскуюць іх і перадаюць беззямельным і малазямельным сялянам [14].

На пасяджэнні акружной камісіі па аддзяленні царквы ад дзяржавы 25 ліпеня 1925 г. прымаецца рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі Свята-Духаўскай царквы з-за няспраўнага ўтрымання, Богаяўленскай царквы і Лютэранскай кірхі — з-за скарачэння колькасці веруючых, рымска-каталіцкаму касцёлу — з-за супярэчання яго Статута Канстытуцыі СССР, а таксама некалькім сінагогам, бо іх члены абмежаваны судом у правах. Аднак яшчэ некалькі гадоў гэтыя храмы будуць працаваць. ДПУ пры НКУС дэталёва вывучала змест Статутаў рэлігійных абшчын, аднак калі акрвыканкам прапанаваў закрыць і Спаса-Еўфрасіннеўскую абшчыну, прадстаўнікі ДПУ выказаліся супраць. Яны палічылі, што такія дзеянні ўзмацняюць уплыў на веруючых паплечнікаў Патрыярха Ціхана, і рэкамендавалі знайсці больш уважлівыя прычыны для закрыцця абшчыны, чым асобныя палажэнні яе статута. У канцы 1925 г. Еўфрасіннеўская абшчына пераходзіць у «абнаўленства». У гэтым жа годзе ўлады закрываюць Сафійскі сабор і перадаюць яго памяшканне пад краязнаўчы музей. У 1926 г. быў закрыты адзіны ў горадзе касцёл.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-127-132

У снежні 1926 г. была створана Полацка-Себежская «абнаўленчая» епархія з Епархіяльным упраўленнем у Полацку. Наступленне «абнаўленцаў» прыводзіць да закрыцця ў 1929 г. Спаса-Праабражэнскай царквы і падпарадкавання «абнаўленчай» епархіі Іаана-Багаслоўскай, Богаяўленскай і Мікалаеўскай цэркваў. Аднак за запазычанасць па падатках Мікалаеўскі сабор будзе закрыты вясной 1930 г., а ў хуткім часе ўлады закрыюць Богаяўленскую і Іаана-Багаслоўскую цэрквы. У другой палове 1930-х гг. у Полацку дзейнічае толькі адна «абнаўленчая» царква — Свята-Духаўская. Прыхільнікі Патрыярха Ціхана ў горадзе збіраліся на набажэнства ў Пакроўскай царкве аж да моманту яе закрыцця ў 1937 г. [1, с. 194].

Канец 1920-х — 1930-я гг. — перыяд рэпрэсій супраць прадстаўнікоў усіх канфесій. Галоўнымі інструментамі рэпрэсіўнай палітыкі ўлад сталі абмежаванне ў правах (немагчымасць удзельнічаць у выбарчай кампаніі) або пазбаўленне іх, канфіскацыя асабістай маёмасці, высылка за межы пастаяннага пражывання, зняволенне ў турму або лагер, растрэл. У 1927 г. былі арыштаваны ксяндзы касцёла Маці Божай Адольф Філіп, Міхаіл Цакуль, вартаўнік Іосіф Цывінскі і веруючы Люцыян Вянцковіч. Пакаранне А. Філіп адбываў у Салавецкім лагеры. Праз 10 гадоў — вызвалены і зноў арыштаваны, пасля — растраляны. М. Цакуль жа праз 2 гады будзе вызвалены з абмежаваннем у правах, але таксама растраляны ў 1937 г. [17, с 257, 413, 426]. Рэпрэсіі 1927 г. закранулі і «абнаўленчую» царкву Полацка: быў арыштаваны і праз 10 гадоў растраляны архіепіскап Сяргей Дабрамыслаў, 3 гады правёў у заключэнні настаяцель Свята-Духаўскай царквы Яўлампій Карышаў. У 1930 г. арыштаваны і настаяцель Пакроўскай царквы Стэфан Пакроўскі. У другі раз яго арыштуюць у 1937 г. і па прыгавору суда растраляюць. 10 гадоў у зняволенні правядзе яшчэ адзін святар Пакроўскай царквы — Ігнат Фралоў. Абмежаванне ў правах атрымала па прысуду ў 1932 г. былая паслушніца Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра Анастасія Казакова. Такія ж працэсы разгортваліся і ў сельскай мясцовасці. Арыштоўвалі святароў (Андрэй Гаўрыленка, в. Юравічы; Дзмітрый Аляксандраў, в. Банонь; Сцяпан Ігнатоўскі, в. Шумаценкі; Іван Гнядоўскі, в. Сіроціна) і членаў іх сем'яў (Марыя Сакалоўская, жонка святара в. Пяскі), царкоўных старастаў (Аляксей Слабковіч, в. Дубраўка), веруючых (Марыя Камарова — шматдзетная маці, в. Замошша). Амаль усе яны загінулі. За арганізацыю набажэнстваў і антысавецкую агітацыю ў 1937 г. была арыштавана сакратар пратэстанцкай абшчыны в. Свяціца Ганна Валадзько, якой прысуджаны 10-гадовы тэрмін зняволення. Панесла страты і стараверская абшчына в. Жарцы. Былі арыштаваны з канфіскацыяй маёмасці, а пазней і растраляны, Кірыл Гукаў, Фама Гукаў, Патап Зуеў, Мікіта Коласаў і іншыя [20]. Ва ўмовах рэпрэсій некаторыя святары адмаўляліся ад сану і спрабавалі аднавіць свае грамадзянскія правы. Яны звярталіся з адпаведнай заявай ў сельскія Саветы, а тыя хадайнічалі перад вышэйшымі інстанцыямі. Аднак не ўсе такія хадайніцтвы задавальняліся. Так, святарам Якаву Нікановічу з в. Юравічы і Васілю Прыгароўскаму з в. Кахановічы гэта ўдалося, а святарам з в. Лісна Фёдару Лапацінскаму і Канстанціну Шыркевічу было адмоўлена ў аднаўленні грамадзянскіх правоў без тлумачэння прычын [15].

Такім чынам, у барацьбе за свядомасць насельніцтва ў міжваенны перыяд улады Полацкага павета, а потым і акругі, выкарыстоўвалі розныя яе формы: устанаўленне жорсткага кантролю над кіраўнікамі рэлігійных абшчын, канфіскацыю зямельнай уласнасці і царкоўных каштоўнасцей, ракрыццё мошчаў асоб, кананізаваных царквой, падтрымку «абнаўленцаў» з мэтай паглыблення расколу праваслаўнай царквы, закрыццё храмаў, адкрытыя гвалтоўныя дзеянні супраць святароў, іх сем'яў і простых веруючых па сфабрикаваных абвінавачваннях.

## СПІС ВЫКАРЫСТАННЫХ КРЫНІЦ


1. Бараненка, В. В. Да пытання аб прыналежнасці праваслаўных храмаў горада Полацка да царкоўных арганізацый у 1922 — першай палове 1930-х гг. / В. В. Бараненка // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14—15 крас. 2016 г . : у 2-х ч. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агул. рэд. : Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. — Наваполацк, 2016. — Ч. 2. — С. 191—196.
2. Бараненка, В. В. Полацкая абнаўленчая кафедра ў 1926—1933 гг. / В. В. Бараненка // Полацкі музейны штогоднік (зборнік навуковых артыкулаў за 2011 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева, І. В. Воднева, С. В. Нікалаева. — Полацк : НПГКМЗ, 2012. — С. 133—138.

3. Довгяло, Н. В. Административно-контрольные мероприятия органов Советской власти по отношению к конфессиям в 1924—1939 гг. (на примере Полоцкого округа) / Н. В. Довгяло // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Полацк, 22—23 мая 2012 г.) / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Полацкі дзярж. ун-т; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко. — Мінск : Беларус. навука, 2012. — С. 306—313.
4. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку (ЗДАП). — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 115. Арк. 83.
5. ЗДАП. — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 108. Т. 2. Арк. 138.
6. ЗДАП. — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 108. Т. 1. Арк. 33, 42.
7. ЗДАП. — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 108. Т. 2. Арк. 172, 174.
8. ЗДАП. — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 108. Т. 1. Арк. 216, 221.
9. Там жа. Арк. 177.
10. ЗДАП — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 108. Т. 2. Арк. 131.
11. ЗДАП — Ф. 51. Воп. 1. Спр. 115. Арк. 83.
12. ЗДАП — Ф. 104. Воп. 1. Спр. 42 а. Арк. 39.
13. Там жа. Арк. 57.
14. ЗДАП — Ф. 104. Воп. 1. Спр. 62 а. Т. 3. Арк. 92.
15. Там жа. Арк. 8.
16. Иванова, Т. П. Регламентация деятельности религиозных общин на Полотчине в первые годы Советской власти / Т. П. Иванова // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Полацк, 22—23 мая 2012 г.) / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Полацкі дзярж. ун-т ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко. — Мінск : Беларус. навука, 2012. — С. 287—296.
17. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі 1917—1964. — Мінск : Смэлтак, 2009.
18. Сяргеенка, Н. А. Аперацыя «Баявік» : мерапрыемства савецкай улады па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і ліквідацыі мошчаў святых на Полаччыне на пачатку 1920-х гг. / Н. А. Сяргеенка // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2003 г.). — Полацк : НПГКМЗ, 2004. — С. 58—63.
19. Сяргеенка, Н. А. Мошчы святога Андрэя Баболі ў Полацку / Н. А. Сяргеенка // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі : (да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея) / уклад В. Д. Краско. — Полацк : НПГКМЗ, 2008. — С. 189—197.
20. Судьбы православного духовенства и мирян Витебщины (1917—1990). По страницам архивных документов. [Электронный ресурс] / В. В. Горидовец. — Витебск : В. В. Горидовец, [2012]. — 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).
21. Тригорлова, Л. Б. Конфессиональная политика советской власти в Полоцком уезде в 1919—1924 гг. / Л. Б. Тригорлова // Религия и общество—9 : сборник научных статей / под общей редакцией В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. — Могилёв : МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. — С. 40—42.
22. Тригорлова, Л. Б. Изъятие церковных ценностей в Полоцком уезде (1922) в контексте конфессиональной политики советской власти / Л. Б. Тригорлова // Религия и общество—10 : сборник научных статей / под общей редакцией В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. — Могилёв : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. — С. 87—90.
23. Тригорлова, Л. Б. Репрессивная политика властей в отношении священнослужителей и верующих на Полотчине в 1919—1939 гг. / Л. Б. Тригорлова // Религия и общество—14 : сборник научных статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. — Могилёв : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. — С. 178—180.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-127-132

24. Янушкевич, И. И. Антирелигиозная деятельность в Полоцком районе в контексте общественно-политической ситуации в БССР в 1937—1941 гг. / И. И. Янушкевич // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. II міжнар. канфер. (да 20-годдзя арх. і этнагр. экспед. ПДУ), Полацк, 17—18 крас. 2014 г. : у 2-х ч. / пад агул. рэд. : Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. — Наваполацк: ПДУ, 2014. — Ч. 2. — С. 171—177.

## КОНФЕСИОНАЛЬНАЯ ПОЛИТИКА ВЛАСТИ НА ПОЛОТЧИНЕ В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД

*Тригорлова Людмила Брониславовна,*
*ведущий научный сотрудник Краеведческого музея — филиала НПИКМЗ*

*В статье даётся краткая характеристика взаимоотношений власти и религиозных общин на Полотчине в межвоенный период, отмечаются основные формы антирелигиозной политики и репрессий против священников и верующих.*

***Ключевые слова**: конфессии, конфискация, вскрытие мощей, репрессии.*